школьнага развіцця, іх гуманізм да «люду простага паспалітага». Дзякуючы С.Буднаму і В.Цяпінскаму, рэфармацыйна-рэлігійныя плыні і брацкі рух на землях Велікага княства Літоўскага станавіліся на пазіцыі развіцця ідэй рэнесансных гуманістычных традыцый, якія ў пэўнай ступені жывуць і сёння ў нацыянальнай беларускай асветніцкай і мастацкай справе.

**Майсеенка А.Ф.**, *дацэнт*

## ДУХОЎНА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА ЯНКІ НЁМАНСКАГА Ў КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Янка Нёманскі прыйшоў у літаратуру ў 20-я гады, якія вызначаліся зменамі, што наступілі пасля бальшавіцкага перавароту ў кастрычніку 1917 года і усталявання савецкай улады ў Беларусі пасля грамадзянскай вайны. Новы гістарычны этап аказаўся напоўненым новымі складанасцямі, часта зусім нечаканымі для тых, хто мужна пераносіў цяжкасці рэвалюцыйнага разлому.

Маладая пісьменніцкая генерацыя, да якой належаў і Янка Нёманскі, павінна была асэнсаваць характар грамадскіх змен, што адбываліся ў краіне, набыць сваю філасофію, эстэтыку, стварыць мастацтва, якое адказвала б на праблемы сучаснасці. Сацыяльны змест, сацыяльны фактар быў вылучаны ў цэнтр усяго літаратура-грамадскага працэсу ў 20-я гады, і гэта давала адчувальны імпульс для працы Янкі Нёманскага перш за ўсё ў жанры апавядання.

Янка Нёманскі, як і Кузьма Чорны, Міхась Зарэцкі, Міхась Лынькоў і інш., не быў толькі (ці нават пераважна) апавядальнікам,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

але пакінуў немалую навелістычную спадчыну, у якую ўвайшлі апавяданні, што сталі класікай. Праца ў малым жанры не была для Янкі Нёманскага чымсьці ізаляваным ад галоўных творчых задач і пошукаў. У 1922 годзе ён упершыню выступіў са сваім апавяданнем «Над Кроманню» ў часопісе «Полымя», а першы свой зборнік «На зломе» выдаў у 1925 годзе.

Нельга не адчуць напружанай, нярэдка трагічнай атмасферы апавяданняў «Маці», «Тодар Базылёнак», «Над Кроманню», «Рамэа і Джульета на Беларусі» Я.Нёманскага. Калі гаварыць агульна, тэма гэтых твораў -- барацьба за вызваленне асобы ад усяго заганнага, што перашкаджае чалавеку адчуваць сябе паўнапраўным грамадзянінам сваёй краіны, імкненне чалавека да новых шляхоў і даляглядаў.

Апавяданне «Тодар Базылёнак», напрыклад, ахоплівае шмат падзей, насычана багатым сацыяльным зместам, вялікім жыццёвым і бытавым матэрыялам, якога, без перабольшання, хапіла б на сур'ёзны сацыяльна-псіхалагічны раман. Структуру апавядання складаюць некалькі сюжэтных ліній, якія то развіваюцца паралельна, то кантрастуюць, то адцяняюць адна другую, зліваючыся ў адным апавядальным патоку. Апавяданне «Тодар Базылёнак» з'яўляецца не толькі гісторыяй некалькіх чалавечых лёсаў, але і творам аб цэлай эпосе, паспяховай спробай убачыць яе адначасова і ў вымярэннях мінулага, і ў вымярэннях сучаснага і будучага.

Асэнсаванне складаных сацыяльных праблем заўважаецца і ў апавяданні «Зварот», у якім адчуваюцца плённая вучоба ў А.Чэхава, творчае выкарыстанне аўтарам чэхаўскіх гумарыстычных традыцый. У «Звароце» Я.Нёманскага прыметна пэўнае перайманне сюжэтных момантаў апавядання А.Чэхава «Смерць чыноўніка». Апрача таго, у ім ёсць глыбінная, апасродкаваная сувязь з другім творам выдатнага рускага пісьменніка — з апавяданнем «Чалавек у футляры». Чэхаўскі вобраз «чалавека ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

футляры», што вырас у абагульнены сімвал утробнай сытасці, раўнадушша і казёншчыны, запалохвання і запалоханасці, творча быў выкарыстаны Я.Нёманскім, каб паказаць працэс трагедыі тых, хто не здолеў ці не захацеў пайсці за бальшавікамі, не пажадаў парваць з традыцыямі мінулага, не захацеў стаць, у адпаведнасці з патрабаваннем савецкай улады, удзельнікам будаўніцтва таталітарнага ладу.

Не толькі з родных і добра знаёмых крыніц чэрпаў Я.Нёманскі сокі, што дапамагалі росту і ўзбагачэнню нацыянальнай прозы. Апавяданні яго, не паслабляючы сваёй арганічнай сувязі з усходнеславянскай традыцыяй, разам з тым выяўляюць большую чуласць да шматскладанага вопыту заходняй зарубежнай літаратуры. Я.Нёманскі плённа вучыўся на дасягненнях рускай і заходнееўрапейскай класікі. Распрацоўваючы традыцыйныя праблемы, традыцыйныя сюжэты, пісьменнік «зазямляў» іх у беларускай глебе, робячы непаўторна нацыянальнымі.

Прыкладам гэтага можа служыць апавяданне «Рамэа і Джульета на Беларусі». Выяўляючы творчую смеласць, Я.Нёманскі пайшоў на рызыкоўнае спаборніцтва з Шэкспірам, і небеспаспяхова. Апора на сюжэт выдатнага англійскага драматурга надала твору Я.Нёманскага аб закаханых Алесі і Ясю — дзецях беларускай вёскі — новае філасофскае вымярэнне, дазволіла пісьменніку глыбей асэнсаваць нядаўнюю рэчаіснасць. І хоць трагічныя складанасці кахання маладых герояў апавядання нагадваюць журботную «аповесць аб Рамэа і Джульеце», нельга гаварыць аб простым перайманні. Аўтару ўдалося праўдзіва і пераканаўча паказаць той тып грамадскіх адносін, той уклад жыцця, на глебе якога падобныя сітуацыі абавязкова павінны былі ўзнікнуць.

Апавяданні Я.Нёнскага выяўлялі ўзровень рэалізацыі сугучных ідэй часу. На матэрыяле штодзённага сялянскага бытавання пісьменнік умеў адгукацца творамі вялікага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

драматычнага напружання, выходзіў да значных мастацкіх абагульненняў. Адзначым і такія характэрныя прыметы апавяданняў Я.Нёманскага, як адчувальны антысхематызм, павышаную ўвагу да побыту, да паўсядзённасці, гатоўнасць (здольнасць!) «ухапіць» чалавека ў любы момант яго жыцця (і ў драматычна-напружаны, вяршынны, і ў будзённы, звычайны) і ўзірацца, узірацца ў яго самым пільным чынам, сачыць за самымі дробнымі рухамі яго душы і думкі.

Высока ацэньваючы апавядальную прозу Я.Нёманскага, нельга не адзначыць і тое, што ў 20-30-я гады з прычыны ўмоў гістарычнага развіцця пісьменнік, як, дарэчы, і ўся тагачасная савецкая літаратура, нярэдка разглядаў чалавека надзвычай аднамерна. Чалавек, герой твора, тады выступаў не як мэта развіцця, а як сродак для дасягнення тых ці іншых практычных вынікаў. На пэўных, вельмі кароткіх адрэзках гісторыі ў выключных выпадках чалавек і сам здольны і гатовы заганяць сябе ў рэзервацыю ўсвядомленай неабходнасці. Але ў больш працяглай гістарычнай перспектыве прагрэс на такой аснове немагчымы. І гэта яскрава засведчыў нядаўні крах сацыялізму ў былым СССР і іншых краінах свету.

**Гуліцкая В.А.**, *прафесар*

## СПЕЦКУРС «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАГА МОВАЗНАЎСТВА» Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ РАБОТНІКАЎ КУЛЬТУРЫ

У прафесійнай падрыхтоўцы работнікаў культуры важнае месца павінна адводзіцца мовазнаўчым спецыяльным курсам. Развіццё філалагічнай адукацыі вымагае таго, каб адной з істотных профільных дысцыплін у студэнтаў факультэта



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ